*Пралетарыі ўсіх краін, еднайцеся!*

# ПЕРАМОГА

ОРГАН АНТОПАЛЬСКАГА РК КП (б) Б І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

№ 36 (50) Аўторак, 14 жніўня 1945 г.

## ЗАЯВА СОВЕЦКАГА УРАДА УРАДУ ЯПОНІІ

8 жніўня Народны Камісар Замежных Спраў СССР В. М. Молатаў прыняў японскага Пасла п. Сато і зрабіў яму ад імені Совецкага Урада наступную заяву для перадачы ўраду Японіі:

„Пасля разгрому і капітуляцыі гітлераўскай Германіі Японія аказалася адзінай вялікай дзяржавай, якая яшчэ стаіць за прадаўжэнне вайны.

Патрабаванне трох Дзяржаў—Злучаных Штатаў Амерыкі, Вялікабрытаніі і Кітая ад 26 ліпеня гэтага года аб безагаворачнай капітуляцыі японскіх узброеных сіл было адхілена Японіяй. Тым самым прапанова японскага ўрада Совецкаму Саюзу аб пасрэдніцтве ў вайне на Далёкім Усходзе траціць усякую глебу.

Улічваючы адмаўленне Японіі капітуліраваць, саюзнікі звярнуліся да Совецкага Урада з прапановай уключыцца ў вайну супроць японскай агрэсіі і тым самым скараціць тэрміны сканчэння вайны, скараціць колькасць афяр і садзейнічаць хутчэйшаму аднаўленню ўсеагульнага міру.

Верны свайму саюзніцкаму абавязку, Совецкі Урад прыняў прапанову саюзнікаў і далучыўся да заявы Саюзных Дзяржаў ад 26 ліпеня гэтага года.

Совецкі Урад лічыць, што такая яго палітыка з'яўляецца адзіным сродкам, здольным наблізіць наступленне міра, вызваліць народы ад далейшых афяр і пакут і даць магчымасць японскаму народу пазбавіцца ад усіх небяспек і разбурэнняў, якія былі перажыты Германіяй пасля яе адмаўлення ад безагаворачнай капітуляцыі.

Выходзячы з гэтага Совецкі Урад заяўляе, што з заўтрашняга дня, гэта значыць з 9 жніўня, Совецкі Саюз будзе лічыць сябе ў стане вайны з Японіяй".

В. М. Молатаў заявіў таксама п. Сато, што адначасова з гэтым совецкі Пасол у Токіо, Я. А. Малік перадасць японскаму ўраду гэту заяву Совецкага Урада.

Пасол Японіі п. Сато абяцаў давесці да ведама японскага ўрада заяву Совецкага Урада.

## Заява В. М. Молатава паслам Вялікабрытаніі, Злучаных Штатаў Амерыкі і Кітая

8 жніўня В. М. Молатаў прыняў Пасла Вялікабрытаніі сэра Арчыбальда К. Кера, Пасла Злучаных Штатаў Амерыкі пана В. А. Гарымана і Пасла Кітая пана Фу Він-чана і інфарміраваў іх аб адбыўшымся рашэнні Совецкага Урада аб'явіць з 9 жніўня стан вайны паміж Совецкім Саюзам і Японіяй.

Паслы выразілі задавальненне заявай Совецкага Урада.

## Працоўныя раёна аднадушна адабраюць рашэнне Совецкага Урада

### (НА МІТЫНГАХ)

Паведамленне аб аб'яўленні вайны Японіі з маланкавай хуткасцю абляцела ўсе населеныя пункты раёна. На шматлюдных мітынгах працоўныя раёна аднадушна адабраюць рашэнне Совецкага Урада.

У вёсцы Дзятлавічы, Галоўчыцкага сельсовета, на мітынгу, прысвечаным абмеркаванню паведамлення аб Берлінскай Канферэнцыі Трох Дзяржаў, з інфармацыяй выступіла ўпаўнаважаная райкома партыі т. Шлеймовіч. Яна таксама паведаміла заяву Совецкага Урада ўраду Японіі.

Першае слова ўзяў інвалід Айчыннай вайны Курулюк Павел. Ён заявіў:

—Пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна Чырвоная Армія, пры актыўнай падтрымцы ўсяго совецкага народа, разграміла фашысцкую Германію. Урады Трох Дзяржаў прынялі цвёрдае рашэнне аб Германіі. Яна будзе раззброена, а ваенныя злачынцы панясуць пакаранне. Больш Германія ніколі не будзе пагражаць захаванню міра ва ўсім свеце.

—Пасля разгрому і капітуляцыі гітлераўскай Германіі,—прадаўжае т. Курулюк,—Японія аказалася адзінай дзяржавай, якая стаіць за прадаўжэнне вайны. Мы памятуем усё, што тварылі японскія самураі на нашых Далёкаўсходніх граніцах. І я цалкам адабраю рашэнне нашага Урада. Палітыка Совецкага Урада з'яўляецца адзіным сродкам, здольным наблізіць наступленне міра, вызваліць народы ад далейшых афяр і пакут.

Сяляне вёскі Дзятлавічы ў прынятай рэзалюцыі абавязаліся хутка і без страт убраць ураджай, датэрмінова разлічыцца з дзяржавай па хлебанарыхтоўках, і гэтым самым дапамагчы Чырвонай Арміі хутчэй ліквідаваць апошні ачаг агрэсіі на Далёкім Усходзе.

# Ад Совецкага Інформбюро

## АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА ЗА 9 ЖНІЎНЯ.

На Далёкім Усходзе совецкія войскі з раніцы 9 жніўня па далёкаўсходняму часу перасеклі па шырокім фронце граніцы Манчжурыі ў Прымор'і, у раёне Хабараўска і ў Забайкаллі.

У Прымор'і нашы войскі, зламаўшы моцнае супраціўленне праціўніка, прарвалі жалезабетонную абаранальную паласу японцаў і на працягу дня 9 жніўня прасунуліся наперад да 15 клм.

У раёне Хабараўска нашы войскі на радзе ўчасткаў з боем фарсіравалі рэкі Амур і Усуры, заняўшы пры гэтым горад Фуюань і некалькі іншых населёных пунктаў.

У Забайкаллі нашы войскі, перадолеўшы жорсткае супраціўленне праціўніка, штурмам авалодалі Манчжура-Чжалайнурскім умацаваным раёнам японцаў і занялі гарады і чыгуначныя станцыі Манчжурыя і Чжалайнур.

У раёне возера Буір-Нур нашы войскі авалодалі населёнымі пунктамі Джынджын Сумэ, Хасу Сум, не сустрэўшы асобага супраціўлення праціўніка.

Увогуле за дзень 9 жніўня нашы войскі прасунуліся ад 15 да 22 кілометраў.

Наша авіяцыя наносіла ўдары па асноўных чыгуначных вузлах Манчжурыі—Харбін, Чанчунь, Гірын і портах Сэйсін, Расін.

**Совінформбюро.**

## АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА ЗА 10 ЖНІЎНЯ

На працягу 10 жніўня на Далёкім Усходзе совецкія войскі прадаўжалі з баямі прасоўвацца ў глыб тэрыторыі Манчжурыі.

У Прымор'і нашы войскі пасля упорных баёў штурмам авалодалі вельмі ўмацаванымі даўгатэрміновымі вузламі абароны японцаў—гарадамі і чыгуначнымі станцыямі Пагранічная, Дуннін, Санчагоу і, прасунуўшыся наперад да 30 кілометраў, занялі на Кітайска-Усходняй чыгунцы станцыі Слосуіфынхэ (Хабэй), Сілінхэ і Мацяохэ.

На паўднёвым захадзе і на поўдне ад Хабараўска нашы войскі з баямі авaладалі гарадамі Лобэй, Туллян (Лахасусу)—на паўднёвым беразе Амура і Жаохэ, Хутоу (Хулінь)—на заходнім беразе Усуры і прасунуліся наперад ад названых пунктаў да 20 клм.

У раёне Благавешчанска нашы войскі фарсіравалі раку Амур, занялі на паўднёвым беразе ракі гарады Сахалян, Айгунь і прасунуліся далей на поўдзень на 15 кілометраў.

У Забайкаллі нашы войскі, у выніку імклівага ўдару, з баямі авалодалі важным вузлом дарог і моцным апорным пунктам абароны праціўніка—горадам і чыгуначнай станцыяй Хайлар, а таксама занялі ў раёне возера Далай-Нур чыгуначную станцыю Аргунь і прасунуліся далей ад названых пунктаў на 20 кілометраў.

У раёне возера Буір-Нур нашы войскі выйшлі да прадгор'яў Вялікага Хінгана на поўдзень ад горада Хайлар.

За адзін дзень 10 жніўня нашы рухомыя войскі ў Забайкаллі прасунуліся на 170 кілометраў у бок Вялікага Хінганскага хрыбта.

Наша авіяцыя прадаўжала наносіць удары па асноўных чыгуначных вузлах Манчжурыі.

**Совінформбюро.**

## МАНГОЛЬСКАЯ НАРОДНАЯ РЭСПУБЛІКА АБ'ЯВІЛА ВАЙНУ ЯПОНІІ

**Улан-Батор**, 10 жніўня (ТАСС). Сёння раніцой Малы Хурал і Совет Міністраў Мангольскай Народнай Рэспублікі на сваім аб'еднаным пасяджэнні аднадушна прынялі рашэнне аб аб'яўленні Мангольскай Народнай Рэспублікай вайны Японіі.

## Заява японскага ўрада Совецкаму Паслу ў Токіо

Толькі што атрымана паведамленне з Токіо, што сёння, 10 жніўня, у Совецкага Пасла ў Японіі Я. А. Маліка адбылася сустрэча з японскім міністрам замежных спраў панам Того. Пан Того зрабіў Совецкаму Паслу наступную заяву:

„Японскі ўрад гатоў прыняць умовы дэкларацыі ад 26 ліпеня гэтага года, да якой далучыўся і Совецкі Урад. Японскі ўрад разумее, што гэта Дэкларацыя не заключае ў сабе патрабаванняў, якія ўшчамляюць прэрагатывы імператара, як суверэннага правіцеля Японіі. Японскі ўрад просіць пэўнага ўведамлення з гэтай прычыны".

Пан Того таксама паведаміў, што аналагічная заява перадана ўрадам Злучаных Штатаў Амерыкі, Англіі і Кітая праз Швецыю.

## ПАДАТКОВЫЯ ІЛЬГОТЫ ДЭМАБІЛІЗАВАНЫМ

Совет Народных Камісараў СССР прыняў пастанову аб захаванні падатковых ільгот для дэмабілізаваных з Чырвонай Арміі і членам іх сем'яў.

Гаспадаркам дэмабілізаваных поўнасцю захоўваюцца ў 1945 годзе ільготы па сельскагаспадарчаму падатку, якімі яны карысталіся да звароту ваеннаслужачых з арміі.

Дэмабілізаваныя з Чырвонай Арміі вызваляюцца ад ваеннага падатку ў 1945 годзе. Для членаў іх сем'яў захоўваюцца ў гэтым годзе ільготы па ваеннаму падатку, якімі яны карысталіся да звароту ваеннаслужачых.

На адзін год з дня дэмабілізацыі для дэмабілізаваных і іх жонак захоўваюцца ільготы па падатку на халасцякоў, адзінокіх і маласямейных.

(ТАСС).

В. а. рэдактара
П. СПІРЫДОНАЎ.

ГЛ 14857 Адрас рэдакцыі: г. Антопаль, Совецкая вуліца, дом № 2.